

**Забарона абортаў — панацэя?**

СТАР. 4



**Агучыць сваю праблему на камеру**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Стварыць максімальна свабодныя, прадказальныя, спрыяльныя ўмовы і магчымасці для інвестараў — галоўны прыярытэт і змест рэгіянальнай інвестыцыйнай палітыкі. Органы мясцовай улады Гомельшчыны вядуць пастаянную актыўную работу па пошуку новых партнёраў і адкрыцці новых рынкаў. Паслядоўна знімаюцца бар'еры на шляху развіцця гандлю і тэхналогій, руху інвестыцый і працоўнай сілы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9064 | ▼ |
| Еўра | 2,0914 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0305 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0741 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 204 (28314)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЖЫВАЯ ПРЫРОДА Ў РУКАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхар пасёлка Мір Карэліцкага раёна Пётр НАРБУТОВІЧ знаёміцца з дзейнасцю аграсядзібы «У Нікадзіма», якая сваю работу будуе на культурным, гістарычным і сельскім напрамках адпачынку.**

■ Нашы

## ІВАН З БЕЛАРУСІ

**Пісьменнік Іван Муравейка напярэдадні свайго 95-годдзя расказаў журналістам «Звязды» пра самае запаветнае**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Пра тое, што ў гэтай сціплай хаце, якая знаходзіцца ў цэнтры Любані, жыве ветэран Вялікай Айчыннай вайны, выпадковаму падарожніку падказвае адпаведная шыльдачка. Але не напісана там (ды і навошта, калі і так пра гэта ведае амаль кожны любанец і не толькі), што гэты дом ужо больш як паўстагоддзя з'яўляецца і месцам прытулку, і працоўным кабінетам беларускага пісьменніка Івана Муравейкі.**

Калі мы завіталі ў госці да майстра, нават не здзівіліся, што засталі яго за драўляным сталом у вялікім пакоі — менавіта тут былі напісаны многія творы аўтара. Іван Андрэевіч якраз шліфаваў новы верш, напісаны на днях:

*Іду на «100», але мая душа,*
*Паверце, не старэе, не марнее.*
*Бясконца б слухаў, як гудзе шаша,*
*Як узлятаюць у блакіт арэлі...»*

Я дачытваю верш да канца і лаўлю кожнае слова пісьменніка, якому, між іншым, 21 кастрычніка спаўняецца 95 гадоў!

СТАР. 13

■ Сказаць і пачуць

## Будучае — за паразуменнем

**Не той лепшы, хто ў судзе ўсіх «парве», а той, хто зможа дамовіцца аб супрацоўніцтве да суда**

**Добрыя перагаворшчыкі — людзі, якія могуць прымаць удзел у складаных размовах. А добрыя медыятары — тыя, хто можа дапамагчы наладзіць гэтыя складаныя перамовы. Такая думка прагучала на першым у свеце рускамоўным міжнародным студэнцкім конкурсе па медыяцыі і перамовах, што адбыўся ў Мінску. Дагэтуль падобныя мерапрыемствы арганізоўваліся толькі ў Еўропе і толькі на англійскай мове.**

Унікальнае відовішча прайшло ў форме дзелавой гульні, падчас якой спаборнічала 16 камандаў студэнтаў з васьмі ўніверсітэтаў Беларусі і Расіі пад наглядам 16 суддзяў — медыятараў з Вялікабрытаніі, Расіі і Беларусі, а таксама з удзелам прафесійных канфліктолагаў, псіхолагаў, эканамістаў і юрыстаў.

### Адна гісторыя — розныя шляхі гульні

Праз камерцыйную медыяцыю (урэгуляванне канфлікту ў бізнесе) удзельнікі конкурсу павінны былі вырашыць спрэчку паміж замежным інвестарам, што планаваў будаўніцтва хімзавода, і ўладамі горада, якія на чале з эколагамі выступаюць супраць гэтай ідэі.

Коратка гісторыя гучала так. «У невялікім прыморскім гарадку N. замежны інвестар Герман Кроль наладзіў вытворчасць каляровых угнаенняў шляхам перапрацоўкі рыбы. Частка непрыдатнай для работы прадукцыі выкідвалася на сметнік, адкуль непрыемны пах даносіўся да жыхароў. Інвестар вырашыў мадэрнізаваць вытворчасць праз будаўніцтва новага завода па вырабе ўгнаенняў. Ён прадставіў план і просьбу выдзеліць участак пад будаўніцтва. Узгадненне дакументаў ішло цяжка, з улікам шматлікіх пажаданняў розных органаў. Тым не менш праз год Кроль атрымаў у арэнду на дзевяць гадоў участак зямлі і дазвол на будаўніцтва, яшчэ праз пяць месяцаў — падрыхтаваў праект і набраў штат супрацоўнікаў.

СТАР. 2